УДК 930.1

**В. М. Губская**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт», Мінск*

# БРАТЫ ГАРЭЦКІЯ: ДЗЕЙНАСЦЬ НА ШЛЯХУ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ

Дадзены артыкул ставіць за мэту адлюстраваць ролю братоў Гарэцкіх у гісторыі адраджэння Беларусі. З улікам таго, што дзейнасць Гарэцкіх шматвектарная (Максім Гарэцкі (1893—1938) працаваў на ніве мовазнаўства і літаратуры, а Гаўрыла (1900—1988) — у сферы эканомікі і геалогіі), артыкул прапаноўвае максімальна сціслы агляд дзейнасці выбітных беларусаў, што ўжо знайшла сваіх паслядоўнікаў.

Гісторыя Беларусі прапануе сучаснікам вялікую колькасць іменаў, чый лёс быў звязаны з барацьбой за незалежнасць краіны. У 20-я гг. ХХ ст. гэты працэс быў асабліва насычаны і знакавы для гісторыі нашай дзяржавы.

Агульнавядома, што Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. дала магчымасць беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху рэалізаваць ідэю па стварэнні беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Ужо ў 1918 г. падчас існавання Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), у склад прэзідыума Рады якой уваходзіў М. Гарэцкі, была актыўна разгорнута дзейнасць па развіцці беларускай мовы і культуры як асновы для нацыянальна-культурнага адраджэння.

Дзейнасць на гэтай ніве братоў Гарэцкіх — Максіма і Гаўрылы — мела выключна важнае значэнне. Так, адразу з 1918 г. яны распачалі актыўную дзейнасць па адраджэнні беларускай мовы. 31 мая 1918 г. была напісана прадмова да «Руска-беларускага слоўніка» братоў Гарэцкіх, якая прасякнута шчырымі словамі прагі да адраджэння і самастойнасці: «Знібеець сэрца за розныя падзеі і да працы гукае, бо ўсякая наша бава і маруда надаюць сораму ад іншых народаў і нясуць кару — скананьне мовы бацькаўскае, ці, казаў той, душы беларускае; хаця ж уціскі незлічоныя мы вытрывалі, і ўжо здавалася, што й сонца ў ваконца блiснула.

“Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі!” — згадваў наш пясьняр, нябожчык Мацей Бурачок (1840—1900)».

«Дзеля таго і мы па свайму простаму разуменьню, не маючы адукацыі філялягічнай, для якой на Беларусі аджа універсытэта няма, адно — слухаючы свайго вуха і не зважаючы надта на тое, ці хто хваліць, ці хто ганьбіць будзе, — выкладалі жменю цікавейшых слоў к патрэбе і на добрае ўжываньне маладым адраджоным братом, што па-маскоўску чытаць-пісаць умеюць, а па-беларуску няцца хочуць.

М. і Г. Г.

Смаленск, 31 мая 1918 г.» [1, с. 239].

Так, 12 ліпеня 1918 г. ў «Дзянніцы» была надрукавана аб’ява аб выхадзе ў Смаленску «Руска-беларускага слоўніка» братоў Гарэцкіх. Пазней Гаўрыла Гарэцкі ўзгадваў: «Брат склаў і выдаў у Смаленску невялічкі руска-беларускі слоўнік; я дапамагаў яму працуючы ў той час стэнаграфістам абласнога Саўнаргаса» [2, с. 17].

З ліпеня па жнівень таго ж года ў Маскве распачаў працу Беларускі народны ўніверсітэт (пераважна для школьных настаўнікаў Беларусі), дзе чыталі лекцыі па беларускай гісторыі, мове, літаратуры, геаграфіі.

Такім чынам, першы крок насустрач адраджэнню і самастойнасці краіны быў зроблены. Аднак геапалітычныя межы краіны былі яшчэ не вызначаны дакладна. 12 ліпеня 1920 г. у Маскве была падпісана літоўска-расійская дамова, згодна з якой Літве передаваліся этнаграфічныя беларускія землі: Віленскі край з Вільняй, а таксама Гродна (Горадня), Ліда, Смаргонь, Ашмяны, Нарач, Браслаўскія азёры. Максім Гарэцкі як шчыры беларус быў не згодны з гэтым, таму смела звярнуўся да Міцкевіча-Капсукаса з лістом, дзе ўпэўнена даказваў, што ні ковенскія імперыялісты, ні польскія паны не маюць права на спрадвечныя беларускія землі.

Пасля вызвалення Беларусі ад палякаў (у ліпені 1920 г.) працэс беларусізацыі не спыніўся, а, наадварот, працягваў актыўна развівацца з падачы самага высокага кіраўніцтва. Падчас Х З’езда РКП(б) у сакавіку 1921 г. падкрэслівалася «неабходнасць дабівацца даверу раней прыгнечаных нацый, развіваць на іх роднай мове органы ўлады, суда, курсы і школы як агульнаадукацыйнага, так і прафесійна-тэхнічнага напрамку, культурна-асветныя ўстановы, прэсу, тэатр» [3, с. 197]. У газеце «Савецкая Беларусь» за 1922 г. прыводзіцца меркаванне ў дачыненні да гэтага працэсу самога кіраўніка Наркамнацу Расійскай Федэрацыі І. Сталіна. Як піша М. Мушынскі ў прадмове да кнігі «Гаўрыла Гарэцкі», «іх варта працытаваць дакладна» [1, с. 9]. Ітак, цытата з «Савецкай Беларусі», згаданай у прадмове да вышэйназванай кнігі: «Тут я маю пісульку аб тым, што мы, камуністы, нібыта насаджаем беларускую нацыянальнасць штучна. Гэта няпраўда, бо існуе беларуская народнасць, якая мае сваю мову, адменную ад расійскай, пагэтаму падняць культуру беларускага народа можна толькі на іх мове» [1, с. 9]. Пры гэтым варта звярнуць увагу на рэакцыю М. Мушынскага ад працытаванага. Вядомы даследчык, літаратуразнаўца М. Мушынскі піша: «Дык, можа, сучасныя ўлады і кіраўнікі пракамуністычнай арыентацыі, што настальгіруюць па светлых, шчаслівых днях сталінскай эпохі, у рэшце рэшт ачомаюцца і гучныя

© Губская О. М., 2018

дэкларацыі ажыццявяць на практыцы? Можа, яны ўсвядомяць, што “падняць культуру беларускага народа можна толькі на іх мове»?” [1, с. 10]. З аднаго боку, у гэтым выказванні прачытваецца іронія, з другога — рэкамендацыя разабрацца ў гістарычных фактах і зрабіць правільныя высновы.

Ітак, пачатак 20-х гг. XX ст. падаецца ў гісторыі як працэс актыўнай беларусізацыі. У краіне не хапала настаўнікаў беларускай мовы, культурна-асветніцкіх работнікаў, таму «ў сувязі са зваротам СНК РСФСР прыняў спецыяльны дэкрэт, на вынове якога “культурнікі-беларусы” адкамандзіроўваліся на Радзіму. Адпушчаны былі нават настаўнікі, якія займаліся ў арміі і займалі пасады ніжэй ротнага камандзіра. Да канца 1921 г. каля 300 чалавек, сярод якіх былі беларусы, палякі, яўрэі, вярнуліся на Бацькаўшчыну для правядзення культурнай работы» [3, с. 198].

Гаўрыла Гарэцкі ў гэты час быў студэнтам эканамічнага факультэта Пятроўскай акадэміі ў Маскве, якая перажывала моцны рэвалюцыйны ўздым. Адразу ўступіўшы ў Асацыяцыю рэвалюцыйнага студэнцтва, ён стаў актыўным яе ўдзельнікам, а затым і членам прэзідыума. Думкі аб адраджэнні роднай Беларусі не пакідалі ні на хвіліну. Гаўрыла дакладна разумеў, што Беларусь у выніку шматвяковага культурнага, сацыяльнага і эканамічнага заняпаду стала звычайным занядбалым краем Расійскай імперыі, на які не звяртаюць увагу ні палітыкі, ні даследчыкі. Менавіта таму «па ініцыятыве Гаўрылы Гарэцкага, — як адзначае яго сын Радзім Гарэцкі, — была створана Беларуская культурна-навуковая асацыяцыя студэнтаў Пятроўскай акадэміі, задачы якой вызначаліся так: вывучэнне народнагаспадарчага, грамадска-палітычнага, культурна-нацыянальнага і прыродна-гістарычнага бакоў жыцця Беларусі; выяўленне шляхоў і магчымасцяў культурна-эканамічнага адраджэння Беларусі; прапаганда ідэі адраджэння;барацьба з шавіністычнымі і вузканацыянадьнымі плынямі беларускага адраджэнскага руху; правядзенне мерапрыемстваў, накіраваных на культурна-эканамічнае адраджэнне Беларусі; аб’яднанне і падрыхтоўка культурных працаўнікоў для дзейнасці ў навуковай, гаспадарча-тэхнічнай, культурна-асветнай і іншых сферах; шырокая культурна-асветніцкая праца; арганізацыя навуковых даследаванняў, экспедыцый і іншых мерапрыемстваў на тэрыторыі Беларусі» [4, с. 48—49]. Больш таго, ён актыўна прасоўваў ідэю па стварэнні Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі: «Беларусі патрэбна свая Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія, якая б стаяла на навукова-навучэбнай каштоўнасці разам з заходнееўрапейскімі і расейскімі вышэйшымі сельскагаспадарчымі ўстановамі» [1, с. 48]. Гарэцкі раіў адкрыць Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках (інтэгральную) і Балотны інстытут у Мінску.

Максім Гарэцкі ў гэты час актыўна працаваў на ніве літаратуры. У 1921 г. у Вільні выйшла першая ў гісторыі краіны «Гісторыя беларускай літаратуры» (2-е выданне «Невялічкага беларуска-маскоўскага слоўніка»). Аднак, як адзначае Радзім Гарэцкі, «большасць савецкіх людзей ці зусім не ведалі, ці толькі здагадваліся, што “бальшавізм меў падвойнае дно”, жыў “дзвюма душамі”. Як стала вядома ў постсавецкі час, з вясны 1922 г. Ленін задумаў шырокамаштабную акцыю: выслаць за мяжу ўсіх прадстаўнікоў вальнадумнай інтэлігенцыі… 17 ліпеня ён пісаў Сталіну: “высылаць за границу безжалостно”, “всех их — вон из России”, «арестовать несколько сот и без объяснения мотивов — выезжайте, господа», «Очистим Россию надолго!”» [4, с. 62—63].

Пад такі ленінскі «настрой» трапілі і браты Гарэцкія: 31 жніўня 1922 г. арыштавалі і пасадзілі ў турму на Лубянцы (Масква) Гаўрылу, а ў ноч з 19 на 20 студзеня 1922 г. арыштавалі і завезлі ў Лукішкі (Вільня) Максіма. Пытанне «за што?» не мела рэальнага адказу, аднак фармальны хутчэй за ўсё быў падрыхтаваны загадзя. Гаўрылу Гарэцкага абвінавацілі ў антысавецкай дзейнасці. Вось вытрымка з заключэння: «С момента Октябрьского переворота и до настоящего времени он не только не примирился с существующей в России, в течение 5 лет, Рабоче-крестьянской властью, но ни на один момент не прекращал своей антисоветской деятельности в момент внешних затруднений для РСФСР. Все это подтверждается имеющимися материалами» [4, с. 64]. Аднак Гаўрыла Гарэцкі, як кажуць, нарадзіўся ў сарочцы. Колькасць станоўчых характарыстык з месца вучобы, моцная падтрымка сяброў-камуністаў вымусілі прадстаўнікой ДПУ перагледзець справу Гарэцкага. Вынік быў станоўчы: антысавецкая дзейнасць Гарэцкага даказана не была, 10 кастрычніка справу вырашылі спыніць.

Максіму пашчасціла менш. Яго арыштавалі польскія ўлады па абвінавачанні ў «прыналежнасці да партыі камуністаў, у арганізацыі тайных баявых дружын з мэтаю замаху на дзяржаўную ўладу, у друкаванай і вуснай прапагандзе» [2, с. 30]. Па сведчанні Радзіма Гарэцкага, «дзядзька і праўда дапамагаў падпольшчыкам-камуністам: захоўваў партыйныя грошы, шыфры, рэвалюцыйную літаратуру» [5, с. 28]. За гэта яго спачатку выслалі ў Дзвінск, пазней зноў арыштавалі, перавезлі ў Вільню і праз 3 тыдні выпусцілі пад залог 10 тыс. польскіх марак. Але ж у Мінск пісьменніку ўдалося прыехаць толькі ў кастрычніку 1923 г. Там ён адразу ж узяўся за працу: выкладаў беларусазнаўства ў Беларускім універсітэце, па заказе Камісарыята асветы распачаў працу над складаннем новага курсу «Гісторыі беларускай літаратуры», рыхтаваў да друку новы збор сваіх твораў. Паралельна быў членам Інбелкульта, узначальваў там Слоўнікавую камісію. З задавальненнем прымаў запрашэнні і чытаў лекцыі па беларусазнаўстве і беларускай мове для любога тыпу слухачоў. Працаваў нястомна і рэалізоўваў «запавет Гарэцкіх»: не шкадуючы сіл, рабіць усё магчымае і нават немагчымае ў высакароднай справе адраджэння нацыянальнай культуры, у распаўсюджванні ведаў пра беларускі край, пра яго выдатных сыноў.

Тым часам Гаўрыла Гарэцкі заканчваў свае справы ў Маскве і марыў пра Мінск. У 1924 г. ён стаў аспірантам Навукова-даследчага інстытута сельскагаспадарчай эканоміі Ціміразеўскай сельскагаспадарчай

акадэміі, а праз год — дацэнтам, загадчыкам кафедры сельскагаспадарчай эканоміі і эканамічнай геаграфіі, сябрам Праўлення Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі (Горкі).

Такім чынам, развіццю беларускай навукі быў дадзены добры старт. Ужо ў 1924 г. узнікла пытанне аб пераўтварэнні Інбелкульта ў Акадэмію навук, аднак з улікам таго, што дазвол на гэта давала Масква, пытанне вырашылася станоўча толькі ў 1928 г. Гаўрыла Гарэцкі, нягледзячы на свой узрост (28 год), быў зацверджаны арганізатарам і правадзейным членам (акадэмікам) БАН. На жаль, Максім Гарэцкі ў акадэмікі абраным не стаў, бо быў у «чорным спісе ДПУ». Ён працягвае працу ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, узначальвае дыялекталагічную камісію, займаецца творчасцю.

Аднак 1929 г. становіцца пераломным у гісторыі і Беларусі, і СССР. Узмацняецца барацьба супраць «буржуазнай нацдэмаўшчыны», праводзяцца «чысткі» партыі пад знакам барацьбы супраць трацкістаў, буржуазных нацыяналістаў. Як адзначае Радзім Гарэцкі, «Гэта быў год пераходу да дзікіх таталітарных метадаў кіраўніцтва краінай, калі, па словах Сталіна, “рэпрэсіі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва з’яўляюцца неабходным элементам наступлення”. Савецкі Саюз пераўтварыўся ў сапраўдны “архіпелаг ГУЛАГ”» [3, с. 99]. Канешне, БАН прыцягвала ўвагу вялікіх кіраўнікоў сваёй яркай нацыянальнай акрэсленасцю, як вынік — артыкул у «Комсомольской правде» ад 23 жніўня 1929 г., падпісаны ініцыяламі А. И.: «О выхолащивании классового смысла национальной политики свидетельствует и то, как была создана Академия наук. Это было сделано в кабинетном порядке, без участия масс. Наметили и назначили! Теперь, правда, спохватились — слишком много имен, но чрезвычайно мало подлинных друзей диктатуры пролетариата, настолько мало, что белорусская ксендзовско-черносотенная газета “Крыніца”, выходящая в Польше, нашла для себя возможным писать об академии, созданной советской властью: “Наша акадэмія навук!”» [6, с. 95].

Такім чынам, нягледзячы на тое, што ў 1930 г. краіна ўзнагародзіла Г. Гарэцкага орэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР, ён усё ж такі трапіў пад пільнае вока сістэмы і 24 ліпеня гэтага жа года быў арыштаваны па абвінавачанні ў дзейнасці, накіраванай супраць дыктатуры пралетарыяту, на зрыў паспяховага сацыялістычнага будаўніцтва. Прысуд Г. Гарэцкаму, які праходзіў па справе Працоўнай сялянскай партыі, быў жорсткі — вышэйшая мера пакарання, якую, на шчасце, замянілі на 10 год высылкі ў канцлагер, што знаходзіўся ў пас. Мядзведжая Гара Карэльскай АССР.

Максіма Гарэцкага напаткаў такі ж лёс. Яго затрымалі на некалькі дзен раней — 18 ліпеня таго ж года па справе Саюза вызвалення Беларусі. 10 красавіка Максім быў прыгавораны да 5 год высылкі ў Вятку. Так абодва браты трапілі ў ГУЛАГ за тое, што шчыра і аддана працавалі для сваёй краіны, імкнучыся зрабіць яе годанай, самастойнай і незалежнай.

Нельга абысці ўвагай той факт, што Гарэцкія паехалі ў высылку з сем’ямі. Ларыса Чарняўская, жонка Максіма, узгадвае: «Жылося цяжка. Працавалі мы абое многа, а дастатку не было. Стамляліся, нерваваліся…; …для Максіма становішча ссыльнага было маральна цяжкім. Штодзень ён хадзіў на рэгістрацыю ў камендатуру» [5, с. 31]. І тут трэба аддаць належную павагу і словы захаплення жонкам беларускіх інтэлігентаў, пакінуўшы ўбаку звыклае ўсхваленне жонак рускіх дзекабрыстаў. У беларускай гісторыі ёсць сваё гора і свае прыклады магутнасці духу, пачуцця асабістай годнасці і ўмення ў самых складаных выпадках горда несці званне «беларус».

У высылцы Максім Гарэцкі працягваў пісаць, паралельна асвойваючы і змяняючы розныя спецыяльнасці. Гаўрыла стаў навуковым супрацоўнікам Геалбазы Ленінградскага геолага-разведачнага трэста на Беламорбудзе, потым працаваў як геолаг.

Аднак станоўчыя паводзіны братоў і руплівая праца на дабрабыт дзяржавы не былі заўважаны. У 1937 г., сумнавядомым па працы «троек», братоў Гарэцкіх зноў забраў «чорны воран». Гаўрыла ў той час працаваў на будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага камбіната, а Максім выкладаў рускую мову ў пас. Кіраў.

У выніку следства Гаўрылу, які першапачаткова быў прысуджаны да вышэйшай меры пакарання, вызвалілі, а Максіма 21 снежня перавялі ў Вязьму. 10 лютага 1938 г. беларускага пісьменніка Максіма Гарэцкага расстралялі. Да 45-годдзя заставалася 8 дзён. Як адзначае на гэты конт Радзім Гарэцкі, «парадокс нашага жыцця пры таталітарызме: палякі арыштавалі (Максіма — заўв. аўт.) за пракамуністычную дзейнасць, галоўнае абвінавачанне бальшавікоў — раз сядзеў у польскай турме, значыць польскі шпіён» [5, с. 31].

Пасля смерці Максіма Гарэцкага Беларусь атрымала ў літаратурную спадчыну першы падручнік па гісторыі беларускай літаратуры, «Руска-беларускі слоўнік», 4 тамы выдатнай мастацкай прозы, беларускамоўныя пераклады, як ні парадаксальна, прац Леніна, твораў Лебядзінскага, Фадзеева, Горкага. Рэабілітаваў Максіма Гарэцкага 7 лютага 1959 г. Калужскі абласны суд.

Сёння імя Максіма Гарэцкага ўзначальвае спіс класікаў беларускай літаратуры. Паспяхова дзейнічае Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, якім кіруе Радзім Гарэцкі. Штогод у Мінску праводзяцца Гарэцкія чытанні, на якіх выступаюць даследчыкі творчасці класіка, сучасныя паэты, пісьменнікі, гісторыкі. Творы Максіма Гарэцкага выводзяць беларускую літаратуру ў кантэкст сусветнай. Яго нататкі «На імперыялістычнай вайне» параўноўваюцца з ваеннай прозай Барбюса, Рэмарка, Хэмінгуэя, раман «Віленскія камунары» — унікальны твор са складанай наратыўнай будовай, якая вызначаецца «“двайной падзейнасцю”, слова героя рамана амбівалентнае, бо выяўляе як пазіцыю персанажа, так і самога аўтара» [7, с. 3]. У гэтым творы можна знайсці і элементы авантурнага рамана XVI—XVII ст., і рэалістычную тыпізацыю, характэрную для Э. Заля, Стэндаля, Дзікенса, Бальзака, чые героі імкнуцца сцвердзіць сябе ў грамадстве. Творчасць М. Гарэцкага і па сённяшні дзень утрымлівае шмат загадкавых пытанняў, вартых даследаванняў.

Гаўрыла Гарэцкі быў вызвалены з турмы 22 чэрвеня 1939 г. Высылка зрабіла яго геолагам, і астатнюю частку свайго жыцця ён прысвяціў геалогіі. Нягледзячы на тое, што рэабілітавалі Гаўрылу Гарэцкага 26 красавіка 1958 г., у родную Беларусь ён пераехаў толькі ў 1969-м г.: доўга КДБ не ўпускаў у краіну, не звяртаючы ўвагу нават на просьбы Якуба Коласа. На Радзіму ён прыехаў ужо паважаным даследчыкам, членам рэдкалегіі «Карты четвертичных отложений СССР масштаба 1: 2500000». У Мінску Гаўрыла Гарэцкі адразу прызначаецца загадчыкам сектара палеаграфіі антрапагену ў складзе лабараторыі геахімічных праблем АН БССР і адначасова становіцца намеснікам акадэміка-сакратара аддзялення хімічных і геалагічных навук АН БССР. Менавіта ён сфарміраваў навуковую школу антрапагену ў АН БССР, «зыходзячы з таго, што тэрыторыя Беларусі з'яўляецца прызнаным эталонным рэгіёнам распаўсюджання ледавіковай фармацыі на ўсёй Усходне-Еўрапейскай раўніне» [8, с. 23]. Аднак Гаўрыла Гарэцкі быў не толькі сусветна вядомым вучоным, заслужаным дзеячом навукі БССР, але і грамадскім дзеячом, які працягваў справу братоў Гарэцкіх — рабіць усё магчымае і нават немагчымае для справы адраджэння роднага краю. Ён прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да друку збору твораў брата Максіма, выступаў з публіцыстыкай як палымяны адраджэнец. У артыкуле «Жыццё патрабуе» (1979) ён пісаў: «Першае мае пажаданне такое. Трэба паставіць даследаванні жывой народнай беларускай лексікі XIV—XVIII стагоддзяў. Менавіта народнай, не кніжнай… Другое пажаданне. Трэба шырэй паставіць укладанне мясцовых слоўнікаў жывой беларускай мовы, запісваючы толькі арыгінальныя словы, каб вычарпальна сабраць залаты фонд скарбаў беларускай лексікі. Трэцяе пажаданне. Варта шырока даследаваць сучасныя працэсы жывой мовы…Чацвёртае пажаданне. Трэба скласці слоўнік найбольш пашыраных лексічных памылак у сучаснайй беларускай мове, каб захаваць чысціню беларускай мовы, і вуснай і пісьмовай, папярэдзіць шырокія колы ад пагрозы засмечвання і магчымай дэструкцыі беларускай мовы» [1, с. 158—159].

Як спецыяліст, не абмінаў увагай Гаўрыла Гарэцкі і архітэктуру Мінска. У артыкуле «Аб прыродна-гістарычным асяродку Мінска» (1983) ён дае вельмі актуальныя і для нашага часу рэкамендацыі: «Паколькі геалагічныя і геамарфалагічныя асаблівасці Мінска вызначаны ледавікамі, пажадана адзначыць гэты момант і ў манументальных помніках. У глыбокіх земляных выемках на станцыях метро і на трасах галоўных магістраляў трэба пакінуць прагалы з цікавымі археалагічнымі, геалагічнымі і геамарфалагічнымі з'явамі і адкладамі: старажытнымі драўлянымі хатамі, насціламі вуліц і дарог, гаспадарчымі пабудовамі, калодзежамі, "культурнымі слаямі", крапаснымі валамі, крушнямі валуноў, лінзамі валуноў, галек і жвіру ў марэнах і ў алювіі, стужкавымі глінамі, балотнымі адкладамі, выкапнёвымі косткамі жывёл, пахаванай драўнінай і г. д.» [1, с. 161].

Усё сваё жыццё Гаўрыла Гарэцкі прысвяціў роднай Беларусі, хоць яна і не адразу яго прыняла. Аднак на душы ў яго не было крыўды. Па словах сына Радзіма Гарэцкага, бацька быў вялікі аптыміст. Памёр Гаўрыла Гарэцкі 20 лістапада 1988 г., пакінуўшы значны ўнёсак у няпросты шлях Беларусі да незалежнасці.

Сям'я Гарэцкіх — знакавая для гісторыі развіцця Беларусі. Прайшоўшы няпросты гістарычны шлях ад выдзялення беларускіх зямель са складу Расійскай імперыі да БССР, Максім і Гаўрыла Гарэцкія ні разу не здрадзілі свайму запавету, сваёй мэце — бачыць Радзіму самастойнай, адноўленай пасля шматвяковага сну. Іх не зламалі цяжкасці: мужна перажыўшы выпрабаванні ГУЛАГУ, яны засталіся сапраўднымі грамадзянамі сваёй краіны. Іх імёны сёння — прыклад самаадданага служэння Бацькаўшчыне, якое натхняе сучасныя пакаленні на ўсведамленне неабходнасці бачыць Беларусь самастойнай, вольнай і незалежнай.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Гарэцкі, Г.* Выбранае / Г. Гарэцкі. — Мінск : Беларус. кнігазбор, 2002. — 544 с.
2. *Дасаева, Т.* Летапіс жыцця і творчасці Максіма Гарэцкага / Т. Дасаева. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 86 с.
3. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч. — Мінск : Экаперспектыва, 1996. — 453 с.
4. *Гарэцкі, Р.* Браты Гарэцкія / Р. Гарэцкі. — Мінск : Медысонт, 2008. — 340 с.
5. *Гарэцкі, Р.* Ахвярую сваім «я» / Р. Гарэцкі. — Мінск : Беларус. навука, 1998. — 287 с.
6. *Платонаў, Р.* Палітыкі. Ідэі. Лёсы. Грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолага-палітычнага дыктату ў Беларусі 20—30-х гадоў / Р. Платонаў. — Мінск : БелНДІДАС, 1996. — 245 с.
7. *Губская, В.* Раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» ў кантэксце беларускай прозы 1920—1930-х гадоў: жанравае наватарства : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / В. Губская ; Беларус. дзярж. ун-т. — Мінск, 2012. — 23 с.
8. *Антошка, Я.* Гаўрыла Іванавіч Гарэцкі і яго навуковая і грамадска-культурная дзейнасць / Я. Антошка // Максім і Гаўрыла Гарэцкія: жыццё і творчасць: XIX Гарэцкія чытанні : матэрыялы чытанняў, Мінск, 18 лют. 2011 г. — Мінск, 2011. — 264 с.